РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

80 ГАДОЎ ПЕРАМОГІ 1945–2025

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 МАЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 88 (30476)

# ЗНАМЯНАЛЬНАЯ ДАТА БЕССМЯРОТНАГА ПОДЗВІГУ



Дарагія суайчыннікі!

Шчыра віншую вас з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Гэта свяшчэнная для беларусаў дата — нагода асэнсаваць урокі мінулага, задумацца аб каштоўнасці міру і аддаць даніну павагі тым, хто выратаваў чалавецтва ад фашызму, адстаяў нашу незалежнасць і шчаслівую будучыню.

У сэрцах удзячных нашчадкаў жывая памяць аб кожным з мільёнаў абаронцаў няскоранай Радзімы, хто быў закатаваны і забіты нацыстамі, самаахвярна змагаўся на фронце, у шэрагах партызан і падпольшчыкаў, працаваў у тыле і пасля вызвалення адраджаў краіну з руін.

Такі прыклад выключнай мужнасці і патрыятызму аб'ядноўвае, робіць мацнейшымі і натхняе сучаснікаў на стваральныя здзяйсненні на славу роднай Беларусі.

Мы ганарымся адважным пакаленнем пераможцаў, і наш абавязак перад імі — берагчы мір на сваёй зямлі і захоўваць праўду аб далёкай вайне, дапаўняючы яе летапіс зацёртымі часам імёнамі, падзеямі і фактамі.

У знамянальную гадавіну бессмяротнага подзвігу жадаю ўсім моцнага здароўя, дабра і шчасця.

З юбілеем Вялікай Перамогі!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



«КАЛІ ГАВОРАЦЬ АБ МУЖНАСЦІ, УСПАМІНАЮЦЬ БРЭСТ...» І КОБРЫН 4—5




ВУЧЫЦЦА ПАМЯТАЦЬ... ЯШЧЭ Ў ДЗЯЦІНСТВЕ 8—9



+TV ПРАГРАМА
«БУДЗЬЦЕ МАІМ МУЖАМ»

ТРЭБА БАЧЫЦЬ

# ГРАНДЫЁЗНЫ І ВІДОВІШЧНЫ

**Юбілейны парад Перамогі 9 Мая пачнецца ў 20.30**

Парад пройдзе ў складзе паветранага эшалона, пешай і механізаванай калон. Асаблівасць сёлетняга парада — павялічаная гістарычная частка. Гледачы ўбачаць кавалерыстаў, тачанку з кулямётам, парадныя разлікі афіцэраў з вінтоўкамі і баявымі сцягамі-рэліквіямі воінскіх часцей, якія бралі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Таксама пройдзе зводны разлік інжынераў з сабакамі, медыцынскіх работнікаў і рэгуліроўшчыкаў. Механізаваную калону з 26 парадных разлікаў узначаляць легендарныя танкі Т-34, пройдуць матацыклы, «Кацюша», аўтамабілі з пражэктарамі і зенітнымі ўстаноўкамі.



У складзе паветранага эшалона пройдуць 39 паветраных суднаў (12 верталётаў і 27 самалётаў). З іх 35 адзінак ад Міністэрства абароны Беларусі і 4 адзінкі авіяцыйнай тэхнікі ад Расійскай Федэрацыі. Расію будзе прадстаўляць авіяцыйная група вышэйшага пілатажу «Рускія віцязі» на самалётах Су-30СМ. З улікам наступлення цемры паветраныя судны ажыццяўляюць пралёт з праблісковымі агнямі, што, безумоўна, дадасць відовішчнасці мерапрыемству.

Пешая калона — гэта 33 парадныя разлікі, 30 з іх прадстаўляюць сілавыя структуры і ведамствы Рэспублікі Беларусь, а тры разлікі — ад нашых гасцей з замежных дзяржаў. Іх будуць прадстаўляць кадэты Ніжагародскага кадэцкага корпуса Прыволжскай федэральнай акругі імя генерала арміі В. Ф. Маргелава, курсанты Міхайлаўскай ваеннай артылерыйскай акадэміі з Санкт-Пецярбурга і ганаровая варта Народна-вызваленчай арміі Кітая. Акрамя таго, удзел возьмуць 5 груп, якія нясуць сцягі, ад Азербайджанскай Рэспублікі, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі, Рэспублікі Таджыкістан і Рэспублікі Узбекістан.

Завершацца святочныя мерапрыемствы у гонар Дня Перамогі традыцыйным салютам, які прагрыміць у 21.40. Неба ўпрыгожыцца на пляцоўках каля гасцініцы «Беларусь», каля Нацыянальнай бібліятэкі, «Чыжоўка-Арэны», набярэжнай у парку «Дразды», парках імя Уга Чавеса і Паўлава.

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

TikTok

ISSN 1990 — 763X
25088>

# «БЕЛАРУСЬ ДЛЯ ВАС АДКРЫТАЯ»

## Афрыканскі кантынент становіцца бліжэйшым

У Палацы Незалежнасці зноў госці. Гэтым разам з Рэспублікі Гвінея-Бісау. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з Прэзідэнтам гэтай краіны Умару Сісоку Эмбала. Кіраўнікі дзяржаў ужо сустракаліся ў лістападзе 2024 года на палях кліматычнага саміту ў Баку. Тады ж Аляксандр Лукашэнка запрасіў свайго афрыканскага калегу наведаць Беларусь.



Фота БелТА.

У сакавіку гэтага года лідары абмеркавалі парадак візіту падчас тэлефоннай размовы, якая адбылася па ініцыятыве Прэзідэнта Гвінеі-Бісау. Як паведамляла тады прэс-служба беларускага лідара, Прэзідэнты абмяркоўвалі і комплекс двухбаковых адносін і кірункаў, па якіх бакі зацікаўлены развіваць узаемадзеянне.

Размова аб актывізацыі супрацоўніцтва, яго асноўных кірунках і патэнцыяле працягнулася і ў Палацы Незалежнасці. У Зале ўрачыстых цырымоній кіраўніка афрыканскай дзяржавы сустрэў беларускі лідар.

Вітаючы гасцей, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што візіт дэлегацыі Гвінеі-Бісау праходзіць у асаблівы, урачысты для Беларусі час святкавання юбілею Перамогі над фашызмам у Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнах.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што разам з Умару Сісоку Эмбала яны на розных форумах «на нагах» абмяркоўвалі праблемы, якія сёння ёсць у свеце, праблемы ў Беларусі і Гвінеі-Бісау. «І дамовіліся аб тым, што мы будзем шчыльна працаваць для таго, каб задачы, якія перад намі стаяць, вырашаліся, — нагадаў ён. — Мы добра ведаем магчымасці вашай дзяржавы, вашай краіны, вашага народа. Упэўнены, што вы вывучылі нашы магчымасці. Мы да вашых паслуг».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ведае аб патрэбах Гвінеі-Бісау ў сельскай гаспадарцы, якая развіваецца.

«Вы, напэўна, разумееце, што мы здольныя вам тэхналагічна і тэхнічна аказаць адпаведную падтрымку і паслугі. На нас у гэтым плане вы можаце разлічваць», — запэўніў ён.

У графіку дэлегацыі — наведванне вядучых беларускіх прадпрыемстваў, дзе гасцям пакажуць новыя ўзоры прадукцыі, якая там вырабляецца. «Мы адкрыты для пастаў-вак у вашу краіну і прадуктаў харчавання, і прамысловай прадукцыі, адзення, абутку — усяго, што неабходна для людзей, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У нас няма закрытых тэм для супрацоўніцтва, мы гатовы дамаўляцца па ўсіх кірунках, у тым ліку, калі вас будзе цікавіць наш ваенна-прамысловы комплекс. Словам, Беларусь для вас адкрытая».

Умару Сісоку Эмбала падзякаваў беларускаму лідару за гасціннасць. «У мяне ёсць сябры, якія тут працуюць, якія тут вучыліся. Мы ведаем, што Беларусь назапасіла вялізны досвед не толькі ў ваеннай сферы, але і ў аграпрамысловым комплексе. І мы хацелі б скарыстацца гэтым досведам. І, канешне, такім чынам адчыніць своеасаблівыя дзверы ў будучыню», — адзначыў ён. Умару Сісоку Эмбала адзначыў, што Беларусь і Гвінея-Бісау не так далёка адна ад адной — усяго дзевяць гадзін палёту на самалёце. «Я вельмі разлічваю на супрацоўніцтва з Беларуссю, нам гэта было б вельмі карысна. Мы можам на розных узроўнях развіваць эканамічныя адносіны», — заявіў лідар афрыканскай краіны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# КАЛІ ЗВАРОТЫ ФАРМІРУЮЦЬ ПАРАДАК ДНЯ

## Падведзены вынікі адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі ў Брэсцкай вобласці

Выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі адбылося ў Мікашэвічах. Сенатары разгледзелі пытанне «Аб выніках работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Брэсцкай вобласці».

У пасяджэнні ўдзельнічалі старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый ВАКУЛЬЧЫК, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Ігар БРЫЛЕВІЧ, члены Савета Рэспублікі, старшыні райсаветаў і райвыканкамаў Брэстчыны.

Адкрываючы пасяджэнне **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** нагадала, што выязныя прыёмы сенатараў у абласцях праводзяцца раз у квартал. «Пазаўчора мы праводзілі прыём, паступіла каля 100 зваротаў, — сказала Наталля Іванаўна. — У іх структуры асабліва нічога не змянілася. Варта сказаць, што цяпер на першы план выходзяць пытанні выкарыстання па мэтавым прызначэнні зямельных участкаў. Наколькі мы можам гэта вырашаць? Чаму ўзнікае пытанне менавіта ў Брэсцкай вобласці? Відаць, яшчэ і таму, што тут жывуць людзі-працаўнікі, яны шмат працуюць на зямлі. У нас таксама вялікая колькасць зваротаў па сямейных адносінах. Ёсць праблема па спагнанні аліментаў, асабліва калі бацькі з'язджаюць працаваць за мяжу. Трэба паглядзець, што ёсць у нашым заканадаўстве, як лепей прымяняць законы, што яшчэ можна зрабіць, дзе найбольш складаныя моманты, якія патрабуюць нашага ўмяшальніцтва».

У самым пачатку Наталля Качанава заклікала да адкрытай размовы:

> **«У нас краіна для народа. Тыя пытанні, з якімі звяртаюцца людзі, павінны быць урэгуляваны ў рамках закона. Калі ёсць праблема, яе нельга замоўчваць. Найперш яе трэба агучваць. І калі для вырашэння пытання трэба адкарэкціраваць закон, то яго трэба карэкціраваць. Няма нічога застылага, жыццё мяняецца».**



Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян сакратарыята Савета Рэспублікі Максім ШЭКО адзначыў павелічэнне колькасці зваротаў да сенатараў у цэлым па краіне. За год на 30 працэнтаў узрасла колькасць паўторных зваротаў. Не страчваюць актуальнасць праблемы ЖКГ і землекарыстання, на другім месцы — ахова здароўя, сацыяльныя пытанні.

Дакладчык прывёў прыклад: пад зваротам з Косава Івацэвіцкага раёна падпісалася 500 чалавек, ледзь не трэць насельніцтва маленькага горада. Жыхары ўказалі, што не першы раз звяртаюцца з ініцыятывамі па добраўпарадкаванні. Самі, як могуць, упрыгожваюць свой населены пункт, адкрылі нават рахунак у банку, а мясцовая ўлада не праяўляе актыўнасці. Пасля звароту ў Савет Рэспублікі была сфарміравана праграма комплекснага развіцця Косава на два гады.

Шматдзетная маці з Баранавіцкага раёна змагла ўзяць участак зямлі для развіцця асабістай падсобнай гаспадаркі толькі пасля звароту ў Савет Рэспублікі. Дарэчы, рашэнне было знойдзена тымі ж органамі ўлады, у якія яна раней не раз звярталася. «Тут ужо ў нас узнікае пытанне: чаму не дапрацоўваюць з грамадзянскімі ініцыятывамі, са зваротамі грамадзян мясцовыя органы ўлады?» — указаў Максім Шэко.

Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Брылевіч прывёў шэраг прыкладаў таго, як праблематыка зваротаў служыць падставай для разгляду праблем на сесіях, прэзідыумах аблсавета. На выязных пасяджэннях брэсцкія дэпутаты разглядалі выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў па рамонце вулічнай і дарожнай сеткі, гандлёвае абслугоўванне вяскоўцаў, будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці. У ходзе форуму былі сфармуляваны прапановы па многіх актуальных праблемах, напрыклад, па паляпшэнні работы з бадзяжнымі жывёламі, павышэнні прадукцыйнасці сельскагаспадарчай жывёлы ў прыватным сектары.

Некалькі канкрэтных прапаноў па паляпшэнні функцыянавання гарадской гаспадаркі і рацыянальнага выкарыстання зямлі ўнеслі старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ і начальнік галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання аблвыканкама Віталь КАРМАНАЎ, кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый УЛАСІК.

Наталля Качанава падзякавала брэсцкім дакладчыкам за тое, што агучылі шмат розных прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, і запэўніла, што ўсе яны будуць уважліва разгледжаны: «Я заўсёды стаю на баку мясцовых органаў улады. Бо ніхто так глыбока не ведае пытанні, як людзі, якія працуюць на зямлі».

У размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла ўменне мясцовых органаў Брэстчыны прыцягваць насельніцтва да агульнай работы на карысць добраўпарадкавання і паляпшэння якасці жыцця. Паводле яе ацэнкі, вельмі важна, што людзі збіраюць грошы, акумулююць іх на спецыяльным рахунку, потым рэалізоўваюць праекты з падтрымкай дзяржавы. Яшчэ Наталля Качанава нагадала пра станоўчы вопыт першага рэгіёна па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў.

Пасля заканчэння выязнога пасяджэння сенатары накіраваліся на РУВП «Граніт». **Генеральны дырэктар сенатар Эдуард ГАЎРЫЛКОВІЧ** расказаў аб гісторыі, напрацоўках і перспектывах прадпрыемства.

Затым дэлегацыя Савета Рэспублікі накіравалася да брацкай магілы воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Хвілінай маўчання ўшанавалі памяць герояў і ахвяр вайны, усклалі кветкі да падножжа манумента.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*г. Мікашэвічы.*
**Фота БелТА.**

# ЗАКОН АБ АМНІСТЫІ ПАДПІСАНЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб амністыі ў сувязі з 80-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Напярэдадні свята Вялікай Перамогі прыняцце гэтага закона азначае праяўленне гуманізму ў беларускім грамадстве, якое імкнецца да рэсацыялізацыі вінаватых асоб.

У адносінах да большасці асуджаных асноўнымі ўмовамі для прымянення ўстаноўленай законам амністыі з'яўляюцца поўнае пакрыццё шкоды (урону), нанесенай злачынствам, а таксама станоўчая характарыстыка ў перыяд адбывання пакарання.

Законам прадугледжваецца вызваленне ад пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці або змякчэнне пакарання за ўчыненне не маючых вялікай грамадскай небяспекі або менш цяжкіх злачынстваў шэрагу катэгорый асуджаных.

Сярод іх — непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, жанчыны і адзінокія мужчыны з дзецьмі да 18 гадоў, інваліды I і II групы, асобы, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС, а таксама атрымалі раненні або захворванні ў перыяд ваеннай службы або службы ў ваенізаваных арганізацыях, і іншыя.

Асуджаным да абмежавання або пазбаўлення волі, якія не падпадаюць пад амністыю ў поўным аб'ёме, тэрмін пакарання будзе скарочаны часткова на 1 год.

Законам прадугледжаны і шэраг навацый. Так, пералік асоб, якія поўнасцю вызваляюцца ад пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, дапоўнены новай катэгорыяй асоб з пэўнымі захворваннямі. Раней не судзімым асобам, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту і асуджаны да пазбаўлення волі на тэрмін да 6 гадоў уключна, пакаранне замяняецца больш мяккім у выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Замест поўнай амністыі ўстанаўліваецца прымяненне частковай у выглядзе скарачэння пакарання на 1 год да асоб, асуджаных за неасцярожныя злачынствы, якія прывялі да смерці чалавека.

Паводле папярэдніх разлікаў, амністыя закране амаль 8 тысяч асуджаных.

Закон уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

***

Таксама Прэзідэнт напярэдадні святкавання Дня Перамогі прыняў рашэнне аб памілаванні 42 чалавек, асуджаных за злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці.

Сярод памілаваных 18 жанчын і 24 мужчыны. З іх 13 маюць хранічныя захворванні, адзін з'яўляецца інвалідам. У 24 асуджаных ёсць непаўналетнія дзеці, двое — шматдзетныя. Дзесяць асоб старэйшыя за 50 гадоў, адзін дасягнуў пенсіённага ўзросту.

Усе яны хадайнічалі аб памілаванні, прызналі віну і раскаяліся ва ўчыненым.

Міністэрства ўнутраных спраў забяспечыць кантроль за іх правапаслухмянымі паводзінамі.

# ОРША — ГОРАД ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ

## Яна разам з Баранавічамі намінавана ад Беларусі на гэта званне ў маштабах СНД



**Беларускія гарады Орша Віцебскай вобласці і Баранавічы Брэсцкай вобласці за ўнёсак у забеспячэнне перамогі над фашызмам намінаваны на прысваенне ганаровага звання СНД «Горад працоўнай славы 1941—1945 гг.». Па даручэнні Прэзідэнта ў кожным з іх будуць устаноўлены памятныя стэлы.**

Рашэнне аб заснаванні ганаровага звання СНД «Горад працоўнай славы 1941—1945 гг.» было прынята восенню мінулага года на Савеце кіраўнікоў дзяржаў. Кожная дзяржава ўносіла прапановы. Беларусь першай вылучыла свае гарады — Оршу і Баранавічы — з улікам наяўных заслуг за масавы працоўны гераізм, самаахвярнасць і ўнёсак у Перамогу, што пацвярджаюць канкрэтныя факты і імёны людзей.

Аб гэтым на цырымоніі закладкі капсулы з пасланнем будучым пакаленням на месцы, дзе ў Оршы з'явіцца стэла, расказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка. «Цяпер ідзе працэс узгаднення. Думаю, у маі рашэнне будзе падпісана», — адзначыў ён.

«Гэта ацэнка працы папярэдніх пакаленняў, наша даніна і папярэднім, і будучым пакаленням. Асабліва сімвалічна гэта напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне», — цытуе sb.by спікера Палаты прадстаўнікоў.

Гаворачы непасрэдна пра Оршу, Ігар Сергяенка падкрэсліў, што гэта горад баявой і працоўнай славы, жыхары якога праявілі вялікую мужнасць і гераізм з першых дзён вайны. Тут упершыню прагучалі залпы легендарнай «Кацюшы». Адсюль пачаўся магутны падпольны і партызанскі рух. Пасля вызвалення Орша таксама змагла хутка мабілізавацца і на працягу 1944—1945 гадоў аднавіць працу прадпрыемстваў, арыентаваўшы яе ўжо на патрэбы фронту і Перамогі. Баявыя і працоўныя заслугі паслужылі падставай намініраваць Оршу на прысваенне гэтага ганаровага звання, падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў:

— Сёння Орша з'яўляецца важным прамысловым цэнтрам Віцебскай вобласці. Пры гэтым непазнавальна горад змяніўся за апошнія гады. Гэтаму садзейнічала зацверджаная Прэзідэнтам праграма развіцця Аршанскага раёна, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Дзякуючы ёй атрымалі новае жыццё шэраг прадпрыемстваў. Магутны імпульс атрымала сацыяльная сфера, якая працягвае дынамічна рухацца наперад. Растуць новыя мікрараёны. Горад жыве і актыўна развіваецца.

**Фота БелТА.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# САЦЫЯЛЬНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ І ЗБАЛАНСАВАНЫ ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ

## Праграма дзейнасці ўрада на 2025—2029 гады адобрана Палатай прадстаўнікоў



**Адкрываючы пасяджэнне, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА звярнуў увагу на тое, што яшчэ на стадыі распрацоўкі праграмы прапановы дэпутатаў былі накіраваны ў Міністэрства эканомікі, асобныя з іх улічаны.**

«Асноўныя мэты праграмы зыходзяць з задач, пастаўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь перад усімі дзяржаўнымі органамі, — падкрэсліў спікер. — Гэта, у прыватнасці, павышэнне ўстойлівасці эканомікі, развіццё чалавечага патэнцыялу, новыя стандарты якасці жыцця, прасоўванне лічбавых тэхналогій, рэалізацыя патэнцыялу кожнага рэгіёна, развіццё экспарту. У цэлым праграма захоўвае сацыяльную накіраванасць». Дакументам прадугледжана падрыхтоўка цэлага шэрагу нарматыўных прававых актаў, у тым ліку законаў. Перад дэпутацкім корпусам пастаўлена задача — падключыцца да іх распрацоўкі на самых ранніх стадыях.

### «ДАРОЖНАЯ КАРТА» РЭАЛІЗАЦЫІ КЛЮЧАВЫХ ПРЫЯРЫТЭТАЎ І ЗАДАЧ НОВАЙ ПЯЦІГОДКІ

Як адзначыў **Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН,** прадстаўленая праграма падрыхтавана ў адпаведнасці з перадвыбарнай праграмай кіраўніка дзяржавы, даручэннямі, дадзенымі пры прызначэнні новага складу ўрада, а таксама агучанымі ў інаўгурацыйнай прамове Прэзідэнта. Акрамя таго, пры падрыхтоўцы гэтага дакумента ўрад абапіраўся на вынікі маштабнага сацыялагічнага даследавання чаканняў беларусаў, праведзенага Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў.

«Па сутнасці, падрыхтаваная праграма — гэта «дарожная карта» рэалізацыі ключавых прыярытэтаў і задач новай пяцігодкі, якая вызначае стратэгічныя рэгулятарнага асяроддзя для развіцця эканамічнай і сацыяльнай сфер», — канкрэтызаваў Аляксандр Турчын.

Прэм'ер-міністр агучыў асаблівасці праграмы, якія вызначылі падыходы да яе распрацоўкі і зместу. «Галоўнымі мэтавымі арыенцірамі дзейнасці ўрада вызначаны павышэнне дабрабыту і дасягненне высокіх стандартаў жыцця насельніцтва краіны. На іх рэалізацыю будуць накіраваны ўсе інструментары эканамічнай палітыкі», — адзначыў ён.

### НА ШЛЯХУ ДА СТАНДАРТАЎ КАМФОРТНАГА ПРАЖЫВАННЯ

Як акцэнтаваў увагу Прэм'ер-міністр, галоўная мэта Праграмы дзейнасці ўрада — забяспечыць сацыяльную стабільнасць у грамадстве і збалансаваны эканамічны рост. «Усе наяўныя ва ўрада рэсурсы, як таго і патрабуе кіраўнік дзяржавы, будуць сканцэнтраваны выключна на вырашэнні найбольш важных пытанняў, якія хвалююць насельніцтва», — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Па яго словах, ставіцца задача забяспечыць насельніцтва даступным арэндным жыллём. «Плануецца пабудаваць каля 5 млн кв. метраў такога жылля, — канкрэтызаваў кіраўнік урада. — Агульны аб'ём фінансавання складзе 13,5 млрд рублёў. Гэта мера павінна стаць адной з найважнейшых па прыцягненні і замацаванні спецыялістаў у рэгіёнах. Прынцып просты: прыйшоў на завод, сельскагаспадарчае прадпрыемства — хутка атрымаеш сваё жыллё».

Захаваецца дзяржпадтрымка пры будаўніцтве жылля для шматдзетных сем'яў, дзяцей-сірот, іншых уразлівых катэгорый грамадзян. «Як вынік — наблізімся да сярэднееўрапейскага ўзроўню забяспечанасці жыллём: 33 кв. метры на аднаго жыхара», — канстатаваў Прэм'ер-міністр.

Ён звярнуў увагу на тое, што будзе забяспечаны пераход ад мінімальных сацыяльных стандартаў да стандартаў камфортнага пражывання. «Гэта значыць, узровень жыцця нашых грамадзян у рэгіёнах будзе набліжаны да ўзроўню жыцця ў сталіцы, — сказаў кіраўнік урада. — Сістэма стандартаў ужо распрацавана і праходзіць апрабацыю».

У цэлым за пяцігодку ў краіне плануецца пабудаваць і рэканструяваць больш за 650 аб'ектаў інфраструктуры з агульным аб'ёмам фінансавання звыш 20 млрд рублёў. Сярод іх — 34 бальніцы, 23 дзіцячыя садкі, 27 школ, 22 фізкультурна-аздараўленчыя комплексы.

«Палепшым транспартныя зносіны паміж рэгіёнамі, — заявіў Аляксандр Турчын. — Пабудуем і адрамантуем больш за 24,5 тыс. кіламетраў дарог з аб'ёмам інвестыцый каля 13 млрд рублёў. Створым хуткасныя дарожныя звязкі «аграгарадок — райцэнтр — абласны цэнтр». Напрыклад, час у дарозе ад Мінска да любога горада-спадарожніка будзе займаць да паўгадзіны, ад населеных пунктаў да абласнога цэнтра — гадзіну-паўтары».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ПА СУТНАСЦІ

# КОД ПЕРАМОЖЦАЎ



Як ніколі не надакучыць смак хлеба, так ніколі беларусы не перастануць святкаваць Дзень Перамогі. А калі перастанем, то мы будзем ужо не беларусамі. Гэта наша ідэалогія, светапогляд. А яшчэ гэта нашая гісторыя — агульная і кожнай асобнай сям'і. Гэта боль, але гэта і вера, гэта наша Перамога. Усяго савецкага народа і ўсіх беларусаў. Але Перамога для нас — гэта не толькі наступальнае «ўра», для нас гэта кожны трэці, хто не дажыў, не далюбіў, гэта скрадзеная будучыня.

Але беларусы зусім не нацыя ахвяр, беларусы — нацыя пераможцаў. Больш за тысячу партызанскіх атрадаў — гэта самы дакладны народны адказ на пытанне: якія мы, беларусы? Мірныя, але не рахманыя, прыязныя, але не баязлівыя. Назавіце мне яшчэ адзін народ, дзе ў асноўным пажылыя мужчыны, жанчыны, а таксама падлеткі (астатнія змагаліся ў рэгулярнай арміі) змаглі ператварыцца ў адзіны народны фронт. Заваёўнікі Еўропы на зямлі «другасортных» славян не адчувалі сябе ў бяспецы. Халадок па спінах адборных гвалтаўнікоў і рабаўнікоў усёй «адукаванай» Еўропы прабягаў не толькі ў вадохрышчанскія дні ў раёне Суражскіх варот, але і ў «ціхія» купальскія ночы пад Пінскам і Мазыром.

Ператварыць беларускія хаты ў хатынскія магілы, утапіць у студнях расстраляныя вяселлі, выцягнуць з беларускіх дзяцей усю кроў, распяць беларускіх дзяўчат, выбухамі зацямніць сонца славян спрабавалі, але не атрымалася. Менавіта наш савецкі сцяг над Рэйхстагам у маі 1945-га стаў маяком для новага светаўладкавання. Гэты ўрок вывучаны, але, як бачым, не ўсімі.

Адмовіцца ад Перамогі сёння — значыць узаконіць светаўладкаванне тых, каго зрынулі і перамаглі 80 гадоў назад. А пакуль у свеце праўда аб Перамозе гучыць, каўровыя бамбардзіроўкі ніколі нельга будзе ўзаконіць. Менавіта 9 Мая 1945-га — апора для нашай планеты. Гэта Перамога дзеля міру.

Адмовіцца ад Перамогі — значыць выбіць глебу з-пад ног у саміх сябе. «Ды што мы з ёй носімся!», «гісторыя была і да Перамогі», — даводзіцца чуць. Так, была, але без Перамогі не было б будучыні. Разбурыць помнікі і памяць — гэта і ёсць сучасны генацыд супраць нас. Без Дня Перамогі лягчэй будзе схіліць галаву беларусаў перад Захадам. Мы бачым, што менавіта так ужо зрабілі з суседнімі краінамі.

Ды што там, так зрабілі і з часткай нашага грамадства. Усім, хто ўдзельнічаў у падзеях 2020-га, усім, хто не задаволены цяперашняй Беларуссю, варта задаць простае пытанне: «Што для цябе Перамога?» Гэта і ёсць пароль да нашай будучыні. Калі замест Дня Перамогі выбіраеш «лакшэры па-заходняму», то губляеш усё: і сябе, і будучыню.

Перамога ніколькі не супярэчыць тысячагадовай гісторыі Беларусі. Наадварот — адлюстроўвае наш шлях да сваёй зямлі, да імкнення людзьмі звацца. Ды і ў прынцыпе шлях барацьбы за мір.

Памяць жывая, пакуль працягваецца размова пакаленняў. З экранаў, каля мемарыялаў, на дыялогавых пляцоўках. А галоўнае — за сямейным сталом. Альбо кансалідаванай талакой на пераможных урачыстасцях.

Вялікая зала Палаца Рэспублікі ўмяшчае 2700 чалавек. Але няма такой аўдыторыі, якая б умясціла ўсю гэтую радасць перамогі і боль перажыванняў нашага народа. Урачыстая атмасфера, цёплыя пачуцці, радасныя эмоцыі. Беларусь. Вясна. Перамога. Зала Палаца Рэспублікі сустракае Прэзідэнта апладысментамі. Першы закрануў самае балючае пытанне для старэйшых пакаленняў і для сучаснай моладзі. Сказаў праўду. Не толькі пра ачарсцвелых і абыякавых да нашай Перамогі, але і пра свае да яе адносіны. Тысячы артыкулаў — публіцыстычных і навуковых, сотні ролікаў — па тэлебачанні і ў сацыяльных сетках — нішто, калі дзіцячае сэрца не страпянецца падчас пераможнага марафону. Нашто тады ўсё гэта?

На ўрачыстым сходзе, як і за некалькі дзён да яго ў Валгаградзе, Аляксандр Лукашэнка гаварыў шчыра і пранікнёна. Гэта хутчэй не выступленне першай асобы нашай дзяржавы, гэта размова па душах наконт таго, ці пакінулі мы месца ў сваіх душах для разумення Перамогі.

Выхаваць і ўзрасціць паслухмяных касмапалітаў — вось з чаго пачынаецца перамога ворагаў. З інфармацыйнай асады. Эканамічная — санкцыі — не дала вынікаў, палітычная пацярпела фіяска. У прамое ваеннае супрацьстаянне баяцца ўцягвацца...

Нападзе — працяглая, жорсткая вайна сэнсаў. Новы паход, націск на Усход — не навіна. Гэта гісторыя. Пакуль нашы продкі будавалі храмы ў Полацку, адкуль вытокі нашай дзяржаўнасці, іх барбаросы і фюрары — план паходу на Усход. Прайшлі стагоддзі, канцэпцыя ўсё тая ж.

Перамога — сакральны элемент нашай нацыянальнай ідэі. Чаму? Бо такой Перамогі няма ў сотняў іншых краін. А дзясятак яе страціў альбо страчвае. Але не мы. Так што сёння Дзень Перамогі — гэта яшчэ і дзень кансалідацыі. Нам варта застацца Беларуссю.

Страціць Перамогу — значыць страціць сябе і ўсю нашу цудоўную краіну. Але Беларусь памятае! І спявае велічную і непаўторную мелодыю жыцця! З Днём Перамогі!

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

З НАГОДЫ

# «Я — КРЭПАСЦЬ, ВЯДУ БОЙ»

## Ганаровае званне «Крэпасць-герой» Брэсцкай крэпасці было прысвоена роўна 60 гадоў таму, 8 мая 1965-га

Брэсцкая крэпасць стала сімвалам мужнасці і стойкасці нашага народа, яго волі да Перамогі, бо першай сустрэла нападзенне карычневай чумы на нашу краіну, прадэманстравала небывалае супраціўленне. Словы Канстанціна Сіманава вельмі ёмка гэта перадаюць: «Калі гаворыць аб мужнасці, успамінаюць Брэст, калі гавораць аб выпрабаваннях, успамінаюць Брэст, калі гавораць аб жыццях, аддадзеных за нашу зямлю, успамінаюць Брэст. Гэта агульны для нас пачатак вайны, сімвал гэтага пачатку — трагічнага і гераічнага...»



Узняцце сцяга над Брэсцкай крэпасцю. 1944 год.

У дзень нападу Германіі на Савецкі Саюз у Брэсцкай крэпасці дыслацыравалася 7 стралковых батальёнаў і адзін разведвальны, два артылерыйскія дывізіёны, некаторыя спецпадраздзяленні палкоў і часцей, зборы прыпіснога складу асобных часцей. На жаль, часці не былі разгорнуты па-баявому і не займалі пазіцый на памежных рубяжах. Некаторыя падраздзяленні знаходзіліся ў лагерах, на палігонах, на будаўніцтве ўмацавальнага раёна. На момант нападу ў крэпасці было ад 7 да 8 тысяч савецкіх воінаў, а таксама 300 сем'яў ваеннаслужачых. Пра ўсё гэта падрабязна расказваюць у Музеі абароны Брэсцкай крэпасці.

З першых хвілін вайны Брэст і крэпасць падвергліся масіраваным бамбардзіроўкам з паветра і артылерыйскаму абстрэлу. Штурмавала Брэсцкую крэпасць нямецкая 45-я пяхотная дывізія (17 тысяч салдат і афіцэраў) ва ўзаемадзеянні з 31-й і 34-й пяхотнымі дывізіямі 4-й нямецкай арміі, а таксама дзве танкавыя дывізіі групы арміі Гудэрыяна пры актыўнай падтрымцы авіяцыі і артылерыі. Вораг разлічваў




# КОБРЫН. АДПОР — У ПЕРШЫЯ ДНІ ВАЙНЫ

Варожая авіяцыя стала бамбіць горад 22 чэрвеня а пятай гадзіне раніцы. І атрымала адпор ад лётчыкаў 123-га знішчальнага палка, якім камандаваў маёр Барыс Сурын. Вораг не разлічваў на тое, што давядзецца прымаць паветраныя баі.

## ПОДЗВІГ ВАЕНЛЁТАЎ

**Дырэктар Кобрынскага ваенна–гістарычнага музея імя А. В. Суворава Алена БАБЕНКА** падкрэслівае: «Нягледзячы на ўстойлівае меркаванне, што ў першыя дні вайны ў пагранічнай зоне ўсе аэрадромы разам з авіяцыяй былі разбіты і знішчаны, да Кобрына гэта нельга аднесці. І ўсё дзякуючы мужнасці і ваеннаму майстэрству Барыса Сурына». Ва ўмовах, калі дзейнічаў строгі загад не паддавацца на правакацыі, а па сутнасці — не рыхтавацца да вайны, 123-і полк знаходзіўся ў поўнай баявой гатоўнасці. Усе 30 самалётаў былі надзейна замаскіраваны. А ў ходзе ранішняй бамбардзіроўкі былі разбіты самалёты, што знаходзіліся на рамонце, а таксама новыя самалёты Як-1, якія не паспелі ўкамплектаваць. Баявыя старыя І-153, якія лётчыкі называлі «Чайкамі», былі не проста падрыхтаванымі, запраўленымі гаручым, з максімальным боекамплектам, у іх на раніцу 22-га... маторы аказаліся прагрэтымі. Гэта ўжо да пытання пра інтуіцыю і прафесійную празорлівасць маёра Сурына.

Пазней музейныя работнікі знойдуць тэхніка гэтага палка Вікенція Стаканава, ён раскажа пра камандзіра і пра першы бой. Кобрынскія лётчыкі адбівалі атакі з чатырох гадзін раніцы да 13 гадзін дня. Тэхнік расказваў аб тым, што быў зладжаны сапраўдны паветраны канвеер: узлёт, кароткі паветраны бой, пасадка, імгненная запраўка альбо нават хуткае латанне дзірак у машыне, загрузка боекамплекта і зноў узлёт. Ваенлёты называлі гэта сістэмай рою: узлёт-пасадка, узлёт-пасадка. Апошняе, апроч іншага, сведчыла пра бездакорную баявую вывучку асабовага складу: упершыню сутыкнуўшыся з ворагам, а не ва ўмовах вучэнняў, пілоты дзейнічалі максімальна дакладна. Сам камандзір палка здзейсніў пяць вылетаў, чатыры з іх — баявыя, збіў тры нямецкія самалёты. У чацвёртым баі быў смяротна паранены, але здолеў пасадзіць самалёт на паласу аэрадрома. Калі тэхнікі палка падбеглі да самалёта, высветлілася, што лётчык ужо мёртвы.

Над небам Кобрына адбыўся адзін з першых паветраных таранаў той вайны. Лейтэнант Рабцаў бясстрашна павёў сваю машыну на варожы самалёт і, дарэчы, выжыў! Ён загіне крыху пазней... Да 13 гадзін 22 чэрвеня з 30 машын 123-га палка ў страі засталося 12. Менавіта апоўдні полк, які застаўся без камандзіра, атрымаў загад рухацца на ўсход, у раён Пінска.

## НАВАТ ТАНКІ ІШЛІ НА ТАРАН

На другі дзень вайны ў ваколіцах горада ішлі цяжкія танкавыя баі. 23 чэрвеня часці 28-га стралковага корпуса генерала Папова і 22-й танкавай дывізіі генерала Віктара Пуганава адышлі ад Брэста да Жабінкі і ўтварылі фронт абароны Камянец — Жабінка — Маларыта. Нягледзячы на тое, што ў 22-й дывізіі засталося каля 100 танкаў з невялікім запасам снарадаў і гаручага, штаб Заходняга фронту запатрабаваў раніцай 23 чэрвеня нанесці контрудар у раёне Жабінкі. Пад ударамі авіяцыі танкавая дывізія і стралковы корпус панеслі вялікія страты. Але нашы воіны трымаліся да апошняга. У жорсткіх баях на подступах да Кобрына нярэдка даходзіла да рукапашнай, байцы і камандзіры праявілі выключны гераізм. Разгарэўся сустрэчны танкавы бой. Экіпажы двух танкаў, калі ў іх скончыліся снарады, таранілі нямецкія танкі. Генерал-маёр Пуганаў камандаваў боем асабіста і загінуў у ім.

Вораг праводзіў узмоцненую артпадрыхтоўку. Сілы праціўніка ў некалькі разоў перавышалі сілы абаронцаў



знянацку захапіць цытадэль, прымусіць савецкі гарнізон капітуляваць. А перад гэтым праціўнік вёў прыцэльны ўраганны абстрэл крэпасці, прасоўваючы шквал агню кожныя 4 хвіліны на 100 метраў углыб. У выніку абстрэлу і пажараў большасць складоў, матэрыяльная частка гарнізона былі знішчаны, разбураны, перастаў дзейнічаць водаправод, перарвалася сувязь. А штабы часцей знаходзіліся ў горадзе. Значная частка байцоў і камандзіраў загінула адразу, гарнізон крэпасці аказаўся раздзелены на асобныя групы.

У самым пачатку вайны ў бой з праціўнікам уступілі пагранічнікі на Цярэспальскім умацаванні, чырвонаармейцы і курсанты палкавых школ. Іх упартае супраціўленне дазволіла раніцай 22 чэрвеня выйсці з крэпасці амаль палове асабовага складу, вывезці некалькі пушак і лёгкіх танкаў у раёны дыслакацыі сваіх часцей, эвакуіраваць першых раненых. У крэпасці заставалася каля 4 тысяч савецкіх воінаў.

Праціўнік меў амаль 10-кратную перавагу. Кожнае з падраздзяленняў арганізоўвала абарону як магло. Днём 24 чэрвеня адбылася нарада камандзіраў і палітработнікаў, дзе вырашалася пытанне аб стварэнні зводнай баявой групы. Камандзірам групы быў прызначаны капітан Зубачоў, яго намеснікам — палкавы камісар Фамін. Рабіліся спробы прарваць акружэнне, але яны аказаліся няўдалымі, вораг знішчаў смельчакоў.

Невялічкі ж гарнізон, які заставаўся ў крэпасці, працягваў змагацца з неверагоднай стойкасцю. Чырвонаармейцам даводзілася адбіваць па 6-8 атак у дзень. Фашысты пусцілі ў ход танкі, агнямёты, газы, падпальвалі і скочвалі са знешніх валоў бочкі з гаручай сумессю. У поўным акружэнні, без вады і ежы, пры поўнай нястачы боепрыпасаў, медыкаментаў гарнізон біўся з ворагам. Да сярэдзіны ліпеня ва Усходнім форце змагалася невялікая група байцоў на чале з маёрам Гаўрылавым. Цяжка паранены, знясілены, ён трапіў у палон 23 ліпеня. Але і пасля гэтай даты асобныя воіны працягвалі супраціўленне.

Апошнія дні барацьбы авеяны легендамі. Пасля вызвалення на сценах крэпасці знойдуць надпісы, пакінутыя абаронцамі: «Памром, але з крэпасці не сыдзем», «Я паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма. 20.07.41 г.». Дарэчы, ніводны са сцягоў вайсковых часцей, якія змагаліся ў крэпасці, не дастаўся ворагу.

Абаронцы крэпасці — воіны больш чым 30 нацыянальнасцяў — да канца выканалі свой вайсковы абавязак, здзейснілі адзін з найвялікшых подзвігаў у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пазней званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена маёру Гаўрылаву і лейтэнанту Кіжаватаву. Каля 200 удзельнікаў абароны ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

А 8 мая 1965 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР крэпасць атрымала ганаровае званне «Брэсцкая крэпасць-герой». З 1968-га на тэрыторыі крэпасці вялося будаўніцтва мемарыяльнага комплексу, які быў урачыста адкрыты 25 верасня 1971 года. Сёння мемарыяльны комплекс з'яўляецца адным з найбольш пазнавальных і папулярных турыстычных аб'ектаў Беларусі. Яго ўжо наведала 27 мільёнаў чалавек з розных краін.

Паводле слоў **дырэктара мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць–герой» Аляксандра КАРКАТАДЗЭ**, толькі за першыя тры месяцы 2025-га ў крэпасці пабывалі наведвальнікі з 10 краін свету, а летась тут прымалі экскурсантаў з 29 дзяржаў: «Нягледзячы на спробу фальсіфікацыі гісторыі, яе перапісвання, перагляду рашучага ўнёску савецкага народа ў справу Перамогі, людзі едуць у Брэсцкую крэпасць. Едуць, каб даведацца праўду.

Цікавасць да нашага мемарыяла расце. Яшчэ адзін пласт работы, якую вядзе калектыў мемарыяльнага комплексу, — гэта ўдзел у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў па патрыятычным выхаванні моладзі. На плошчы Цырыманіялаў прымаюць у піянеры, уручаюць студэнцкія білеты, воіны даюць прысягу. У нас праходзяць музейна-педагагічныя заняткі, выязныя лекцыі, працуюць перасоўныя выставы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Кобрына. Але праціўнік здолеў прарваць гэтую абарону толькі пасля таго, як падцягнуў свежыя танкавыя часці. Змучаныя цяжкімі баямі, пры вострым дэфіцыце снарадаў, зенітных сродкаў, супрацьтанкавай артылерыі войскі 4-й арміі, штаб якой да першага дня вайны знаходзіўся ў Кобрыне, вымушаны былі адысці на ўсход, у раён Гарадца.

Не было панікі, не было масавых уцёкаў сярод байцоў нашай арміі ў першыя дні вайны, — расказвае Алена Бабенка, —а вось пра масавы гераізм быў, подзвігі здзяйснялі і радавыя, і генералы.



## ПАРТЫЗАНЫ І ПАДПОЛЬШЧЫКІ

Немцы занялі Кобрын надвячоркам 23 чэрвеня. Пачаўся перыяд акупацыі працягласцю ў 1124 дні. Новая ўлада пачала з расстрэлаў, у тым ліку і мірнага насельніцтва. Адразу ж у горадзе і ваколіцах сталі фарміравацца падпольныя камітэты і партызанскія атрады. Першы падпольны антыфашысцкі камітэт быў створаны ў вёсцы Турная ў самым пачатку жніўня. Яго ўзначаліў Дзмітрый Барысюк, актыўны падпольшчык перыяду польскай акупацыі. Яго намеснікам стаў Цімафей Краўчук, першы старшыня калгаса на Кобрыншчыне. Некаторыя з членаў камітэта мелі вопыт работы ва ўмовах канспірацыі, таму многія іх акцыі былі паспяховымі і засталіся нераскрытымі.

На Кобрыншчыне актыўна дзейнічала і група жонак ваеннаслужачых, якія загінулі пры абароне Брэсцкай крэпасці. У іх ліку — Галіна Шаблоўская, Кацярына Лісоўская, Вольга Лапаціна, Ксенія Маёрава, Галіна Арбузава. У 1942 годзе яны дапамаглі ўцячы з Кобрынскага лагера 48 палонным, былі на сувязі з партызанамі. На жаль, усе гэтыя жанчыны не дажылі да Перамогі. Загінула шмат мужных кобрынскіх падпольшчыкаў.

Самы малады з іх — 17-гадовы Павел Гетман, які спрабаваў знішчыць гэбіткамісара горада. Хлопца схапілі, пазверску катавалі, але ён нікога не выдаў. Тады яго зацкавалі сабакамі, якіх спецыяльна некалькі дзён не кармілі.

Для акупантаў Кобрын меў важнае значэнне. Тут знаходзіўся чыгуначны вузел — дарога на Маскву і Палессе. Праз Кобрын праходзіў водны шлях, па якім немцы планавалі аднавіць суднаходства. Але ж на абодвух шляхах гэтаму руху перашкаджалі партызаны.

Касцяком партызанскіх атрадаў найчасцей былі вайскоўцы, якія выходзілі з акружэння, да іх далучаліся мясцовыя актывісты і патрыёты. Асабліва значны ўрон акупантам наносіла брыгада імя Чапаева, а ў 1943 годзе на дапамогу партызанам штаб Чырвонай Арміі накіраваў дзве разведвальна-дыверсійныя групы. Гэтыя прафесіяналы дзейнічалі асабліва дзёрзка, яны праводзілі самыя сапраўдныя ваенныя аперацыі, напрыклад, па вызваленні людзей з палону. Іншымі словамі, зямля гарэла пад нагамі акупантаў. У перыяд з 1942 да 1944 года на ўчастку ад Кобрына да Пінска было пушчана пад адхон 398 варожых эшалонаў.

Тыя з байцоў названых дыверсійных груп, якія перажылі вайну, сябравалі паміж сабой усё жыццё і нярэдка сустракаліся менавіта ў Кобрынскім музеі. Першы яго дырэктар Аляксей Мартынаў, таксама былы партызанскі сувязны, ладзіў гэтыя сустрэчы, запісваў успаміны. Былыя франтавікі таксама паспрыялі стварэнню экспазіцыі.

## ЗАХАВАЦЬ І ПЕРАДАЦЬ ПАМЯЦЬ

У ліпені 1944 года партызаны аказалі вялікую дапамогу пры вызваленні Кобрына. Горад вызвалілі 20 ліпеня ў ходзе Люблінска-Брэсцкай аперацыі часці 61-й арміі, якія дзейнічалі ў складзе 1-га Беларускага фронту. 12 часцям названай арміі было прысвоена ганаровае званне «Кобрынскіх».

Пра ўсё названае сёння можна даведацца ў ваенна-гістарычным музеі. Тут сабраны ўнікальныя экспанаты, прысвечаныя перыяду вайны і самай трагічнай старонцы гісторыі — акупацыі. Супрацоўнікі музея з вялікім задавальненнем і гонарам успрынялі паведамленне аб узнагароджанні Кобрына вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». У справе папулярызацыі гістарычных ведаў, шанавання памяці землякоў ёсць, несумненна, і іх вялікая заслуга.

— Мы вельмі ганарымся ўзнагародай, — сказаў карэспандэнту газеты **старшыня Кобрынскага гарвыканкама Аляксандр МАЙСЯЮК**. — Жыхары Кобрына, яго маладое пакаленне беражліва захоўваюць памяць пра герояў. Іх імёны носяць вуліцы горада, два скверы названы ў гонар герояў-вайскоўцаў — Пуганава і Марозава, на месцы танкавых баёў закладзены сквер імя Герояў-танкістаў. У кожнай навучальнай установе, у кожным калектыве праводзяцца тэматычныя мерапрыемствы, згадваюцца героі, якім мы абавязаны магчымасцю жыць і гадаваць дзяцей у свабоднай краіне. Мы ўсведамляем свой абавязак — перадаваць гэтую памяць нашчадкам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Щучинагропродукт»**

**Аукцион состоится 21.05.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

**Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-32457 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание винзавода), обшей площадью 3911,6 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, винзавод около аг. Руткевичи;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-32458 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание проходной), общей площадью 158,5 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, проходная около аг. Руткевичи;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-72450 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), общей площадью 4096,8 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А/2, сооружение благоустройства;<br>- линия электропередач кабельная (электроустановки РУ-0,4 кВ, КЛ-04 кВ, ВУ и внутреннее электрооборудование винзавода).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425886500012000029, площадью 0,2506 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений винзавода, расположенном по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, 39А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, площадь 1,3938 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0595 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0501 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 1,2713 га |
| **Начальная цена продажи** | 397 927,66 руб. (триста девяносто семь тысяч девятьсот двадцать семь рублей шестьдесят шесть копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 39 792 руб. (тридцать девять тысяч семьсот девяносто два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 19.05.2025 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.01.2025 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона https://grino.by/auktsiony | |



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390)
проводит шестые повторные торги
в форме открытого аукциона по продаже:

**ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ, ОБОРУДОВАНИЯ**
(бывшее в употреблении),
принадлежащих **ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»**
(Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 111-2/Б/2017).

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомится на **www.bankrot.gov.by** либо на сайте организатора аукциона **www.cpo.by,** и по тел.: **+375 29 821-47-15.**

**Аукцион состоится 23.05.2025 в 13.00**
по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512.
Заявки принимаются **с 9.00 08.05.2025 по 22.05.2025 до 17.00** по указанному адресу.



ЗАО «Центр промышленной оценки» (УНП 191021390)
проводит пятые повторные электронные торги
в форме открытого аукциона по продаже:

**ОБОРУДОВАНИЯ, ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ**
(бывших в употреблении),
принадлежащих **ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»**
(Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 111-2/Б/2017).

С порядком регистрации для участия в торгах, общими правилами проведения можно ознакомится на **www.bankrot.gov.by** либо на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by), и по **тел. +375 29 821-47-15.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.05.2025 с 09.00 до 16.00.**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются **с 9.00 08.05.2025 по 21.05.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1: Цех подсобных промыслов** (инв. № 420/С-101787, **206,7 кв. м**.). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Огородники, ул. Новая, 1Г** | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,0252 га, предоставлен на праве аренды до 08.11.2071 для строительства и обслуживания здания цеха подсобных промыслов | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 28 874,22 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Лот № 2: Здание бани** (инвен. №: 430/С-61953, **45,2 кв. м**). Адрес: **Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 50, здание бани юго-западнее д. Василевичи** | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0691** га, предоставлен на праве аренды по 29.07.2072 для строительства и обслуживания здания бани. Ограничения (обременения): придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 462,84 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере по лоту № 1 – 6 %, по лоту № 2 – 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда» 16.04.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.05.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | |


# АДЧАЙНЫЯ МСЦІЎЦЫ З ВЁСКІ БЛУДЗЕНЬ

Выжыць у акупацыі... Напэўна, гэтага вельмі хацелі маладыя людзі, якія ўмелі марыць і будавалі планы. Але некаторыя прайшлі праз катаванні, мужна сустрэлі смерць, каб свае мары маглі здзейсніць іншыя. З дзяцінства мне запалі ў душу расповеды пра маладых хлопцаў і дзяўчат з вёскі Блудзень Бярозаўскага раёна, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны стварылі падпольную камсамольскую арганізацыю. Іх імёны не вядомыя так шырока, як славутых «маладагвардзейцаў», але таго вартыя...



## РАШУЧАСЦЬ «ЗАХОДНІКАЎ»

Праз кнігу Аляксандра Фадзеева ўсе даведаліся пра падпольную арганізацыю, якая аб'ядноўвала больш за 70 камсамольцаў Краснадонскага раёна з верасня 1942-га да студзеня 1943 года і была цалкам раскрытая. У той час як блудзенскія маладзёны аб'ядналіся на другі дзень вайны і паспяхова дзейнічалі аж да вызвалення раёна ў ліпені 1944-га, а пасля далучыліся да арміі. Потым яны клапаціліся пра захаванне памяці аб сваіх загінулых сябрах: прозвішчы з ініцыяламі 13 падпольшчыкаў выбіты на мармуровай дошцы, устаноўленай на будынку чыгуначнай станцыі Бяроза-Картузская, дзе былі ажыццёўлены найбольш значныя акцыі. Але не было пісьменніка, роўнага Фадзееву, каб гэтак жа эмацыянальна апісаць гісторыю іх барацьбы. Яна адкрылася дзякуючы публіцыстычным сведчанням Сяргея Руціча, які перад вайной быў сакратаром камсамольскай арганізацыі Блудзенскай сямігадовай школы і разам з сябрамі арганізаваў падполле.

Праз яго прайшло больш за 20 чалавек, што зусім нямала для вёскі, у якой да вайны было крыху болей як 1700 жыхароў. Аднак менавіта ў Блудзені месцілася чыгуначная станцыя Бяроза-Картузская (за некалькі кіламетраў ад самога горада), з канца XIX стагоддзя адна з вузлавых на шляху з Брэста да Масквы. Нездарма самалёты з варожай сімволікай мясцовыя хлопцы заўважылі над чыгункай у першы ж дзень вайны...

Шок хутка змяніўся рашучасцю: ім усяго 16-17 гадоў, у армію не возьмуць, трэба весці сваю вайну. Ужо 23 чэрвеня 1941 года за вёскай на Мартусавых Ямах (тут звычайна адбываліся маладзёжныя «тусоўкі», як бы цяпер сказалі) сабраліся некалькі вясковых камсамольцаў і далі сваю клятву — змагацца з ворагамі нават цаной уласнага жыцця. Ужо на першым сваім пасяджэнні змоўшчыкі клапаціліся пра прыкрыццё і пільнасць — іх неабходнасць не трэба было тлумачыць юным жыхарам Заходняй Беларусі, дзе да ўз'яднання рэспублікі дзейнічала свае падполле. Адзін з яго удзельнікаў — Мікалай Хвядчэня, колішні сябра КПЗБ — перад вайной узначальваў вясковую камсамольскую арганізацыю. Для хлопцаў ён быў старэйшым таварышам, пры тым, што самому на пачатак вайны было крыху больш за 20...

## ЗАХОЎВАЦЬ ТАЯМНІЦУ

Для барацьбы патрэбна была зброя. З першых жа дзён вайны маладыя людзі пачалі збіраць кінутыя вінтоўкі, кулямёты, гранаты. А ўжо 15 ліпеня ўсе жыхары вёскі зразумелі, што гэта бязлітасная вайна. Браты Барушкі намагаліся схаваць зброю ў лесе, мясцовы здраднік нешта западозрыў. Мікола ішоў сцежкай пасярод ржанога поля, а Васіль ехаў на падводзе — менавіта яго «накрылі» паліцаі, жорстка збілі. Не «раскалоўся»... Здзекі працягваліся ля роднай хаты — выцягнулі маці Алену Барушка, якая самлела ад катаванняў. Ці адчуваў Васіль, колькі гадзін пратрымаецца?.. Як знайшоў у сабе сілы на апошнія крокі? Акрываўленага юнака павялі па вёсцы: падаў — сыпаліся новыя ўдары. Ён падымаўся, ішоў далей... Да месца расстрэлу. Нікога не выдаў: у падполлі ўдзельнічалі яшчэ тры яго браты.







**• На фронце**

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, войскі 1-га Беларускага фронту выйшлі на раку Эльбу на поўначы і паўднёвым усходзе ад Магдэбурга, заняўшы пры гэтым гарады Гентын, Цэрбст і буйныя населеныя пункты Шэнхаўзен, Бергцоў, Парэй, Шартау, Гервіш, Лейтцкау, Гердэн, Вальтэрнінбург, Штойтц. За 6 мая войскі фронту ўзялі ў палон 3100 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі на аэрадромах 34 самалёты праціўніка.

«**Войскі 1-га Украінскага фронта, у выніку працяглай асады, 7 мая поўнасцю авалодалі горадам і крэпасцю Брэслаўль (Брэслау)**», — пісала «Звязда».

**Гарнізон нямецкіх войск, які абараняў горад на чале з камендантам крэпасці генералам ад інфантэрыі фон Нігоф і яго штабам, спыніў супраціўленне, склаў зброю і здаўся ў палон.**

7 мая да 19 гадзін нашымі войскамі было ўзята ў палон у горадзе Брэслаўль больш за 40 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 4-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне на захадзе і паўднёвым захадзе ад горада Мараўска Острава, з баямі занялі гарады Фрэйдэнталь, Фрыдланд на Мораў, Мерыш-Нейштат, Штэпанау і буйныя населеныя пункты Вільдгруб, Шумвальд, Медлоў, Хвалковіц, Шмейль, Спалоў, Одры, Палачоў, Лешна. У баях за 6 мая войскі фронту ўзялі ў палон звыш 2 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

**• У тыле**

Наша газета паведамляла, што 4 мая Мінская вобласць выканала ўстаноўлены ўрадам план сяўбы ранніх збожжавых і бабовых культур. Па калгасах вобласці было пасеяна 127 600 гектараў яравых. «**З выключным поспехам прайшла сяўба ў перадавых калгасах Мінскага, Дзяржынскага, Рудзенскага і Заслаўскага раёнаў, якія метадам сацыялістычнага спаборніцтва дабіліся своечасовага разгортвання палявых работ і высокай якасці апрацоўкі глебы. Рад калгасаў значна перавыканалі ўстаноўленыя ўрадам планы сяўбы яравых і пасеялі звыш плана сотні і тысячы гектараў аўса, ячменю і іншых культур**», — пісала «Звязда».

На дапамогу найбольш пацярпелым ад нямецкіх захопнікаў калгасам ехалі перадавыя людзі, стаханаўцы калгасных палёў Мінскага, Дзяржынскага, Заслаўскага, Рудзенскага і іншых раёнаў.

У «Звяздзе» адзначалася: «**Калгасы Мінскага раёна накіроўваюць 300 аратых, баранавальшчыкаў і сейбітаў і 300 коней з плугамі і боранамі ў калгасы Бягомльшчыны. Калгаснікі Дзержынскага накіроўваюць 200 коней у адстаючыя калгасы Плешчаніцкага раёна і 100 коней у Бягомльскі раён. Калгаснікі Заслаўшчыны выязджаюць на дапамогу ў калгасы Лагойскага раёнаў. Жыва адгукнуліся на гэтую справу і калгаснікі Рудзенскага і Уздзенскага раёнаў, якія таксама пасылаюць аратых, сейбітаў і коней у адстаючыя калгасы**».

Перадавыя калгасы абяцалі дапамагчы адстаючым засеяць усе палі і дабіцца адраджэння і росквіту ўсіх калгасаў Міншчыны.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 17 310-36-37 | |
| **Продавец** | ДУП «Автомобильный комбинат» УП «Минскоблсельстрой», г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17. УНП 690019100 | |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by | |
| **Предмет электронных торгов** Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, 17 | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
| 1 | **Трактор с бульдозерным оборудованием ДТ-75 ДЕРС-2** | **20 000,00** |
| 2 | **Экскаватор ЕК-12-00** | **36 600,00** |
| Шаг торгов – 5 % от начальной цены | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 10.06.2025.** **Дата и время окончания приема заявок:** принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by по **09.06.2025 до 17.00** | | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Минского облисполкома и Госкомимущества | | |
| **Контактные данные:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by | | |

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**, организатор торгов по продаже имущества **ООО «АВКОМ СИСТЕМ»** (УНП 192745581), объявляет о проведении **20.05.2025 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке **bankrot-torg.by.**

Полный перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrot-torg.by.**



**Браты Барушкі разам з маці *(у цэнтры)*.**

Паказальнае пакаранне мела адваротны эфект: да падполля далучаліся маладыя людзі. Марыя Колас знайшла дэтэктарны прыёмнік, дзякуючы якому інфармацыю са зводак Саўінфармбюро перапісвалі ад рукі і распаўсюджвалі праз улёткі па вёсках і нават у Бярозе. Ворагі шалелі: на станцыі ўсё пад строгім кантролем. У знакавы дзень 17 верасня Мікалай Хвядчэня ўмудрыўся наляпіць улёткі нават на адміністрацыйныя будынкі. На падпольшчыкаў палявалі, і ён трапіў у пастку, быў цяжка паранены. Допыты не далі выніку, вязня накіравалі ў Брэст да больш дасведчаных службаў. Ён сканаў па дарозе ў цягніку.

Да пачатку 1942 года блудзенскія камсамольцы сабралі 29 вінтовак, 6 кулямётаў, 7 скрынь патронаў, 70 гранат — усё пасля перадалі партызанскай групе Леаніда Здановіча, з якой устанавілі сувязь і каардынавалі дзеянні. Актыўнасць супраціўлення вымушала захопнікаў ладзіць аблавы. Падчас адной з іх Алене Радкевіч прастрэлілі абедзве нагі, і каб не трапіць у палон (пра жорсткія катаванні ўжо ведалі), яна папрасіла брата застрэліць яе... Рашуча пайшоў на смерць Мікалай Пейгановіч, які працаваў у дэпо, — ён падарваў сябе на міне разам з немцамі.

Калі некаторыя падпольшчыкі аказваліся пад падазрэннямі, прымалася рашэнне «схаваць» іх у партызан. Так у лютым 1942 года Сяргей Руціч стаў кіраўніком дыверсійнай групы. Змаганне шырылася, нягледзячы на вельмі жорсткі рэжым: знішчэнне 3 500 чалавек бярозаўскага гета, існаванне лагера смерці на Броннай Гары, дзе забілі больш за 50000.

Кіраўніцтва падполля перайшло да Уладзіміра Саўчука, які працаваў на станцыі Бяроза-Картузская разам з некалькімі паплечнікамі. Здабывалі звесткі пра рух цягнікоў, ахову, грузы. Аднойчы Саўчук даведаўся, што ў адным з цягнікоў у Германію на ўзнагароджанне павязуць афіцэраў з фронту. Група Руціча «ўзнагародзіла» іх па-свойму — замініраваўшы пуці... Яшчэ адна адчайная акцыя атрымалася дзякуючы Аляксею Ніпарку, на якога шмат хто мог глядзець як на ворага: ён уладкаваўся ў паліцыю, каб здабываць каштоўныя звесткі. І аднойчы падпольшчыкі знішчылі 25 паліцаяў, разграміўшы цэлы ўчастак. Пасля Аляксею прыйшлося сысці да партызан, дзе ён удзельнічаў у падрыве васьмі варожых эшалонаў і аўтамашын. Ён застрэліўся, каб пазбегнуць палону падчас аднаго з заданняў у групе Руціча — іх нездарма называлі «няўлоўныя»... У партызанскай вайне рызыкі не менш, чым у падполлі. Мікалай Барушка да пэўнага часу працаваў у колавай майстэрні дэпо, трымаў сувязь з Бярозай, але стаў партызанам-падрыўніком і загінуў у баі.

## ДАЖЫЦЬ ДА СВІТАННЯ

Дыверсіі на чыгунцы дапамагалі здзяйсняць хлопцы, якія працавалі на станцыі. Напрыклад, калі на пуцях спрацоўвала «выбухоўка», то ліквідаваць наступствы з дэпо накіроўвалі аварыйны цягнік. Але часта і ён не даходзіў да месца праз закладзеныя міны... На рахунку юных падпольшчыкаў — дзясяткі выведзеных са строю паравозаў, сур'ёзныя пашкоджанні на тэрыторыі самога дэпо, якія ўскладнялі працу чыгункі.

У пачатку 1944 года, калі сітуацыя на фронце для ворагаў пагоршылася, яны сталі ладзіць больш жорсткія аблавы і расправы. У сакавіку ў сховішчы чыгуначнага дэпо станцыі выявілі некалькі мін. 8 сакавіка арыштавалі Уладзіміра Саўчука, які працаваў памочнікам кладаўшчыка. Каб адвесці падазрэнні ад сябра, Міхаіл Жуковіч і Сяргей Барушка вырашылі падарваць аварыйны цягнік. Але не паспелі — міну выявілі, хлопцаў схапілі. Катавалі тыдзень. Яны вытрымалі іголкі, загнаныя пад пазногці, раны, пасыпаныя соллю. Падвешвалі за ногі ўніз галавой — цярпелі. Знясіленыя юнакі сваім маўчаннем рабілі бездапаможнымі ўзброеных ворагаў. І тыя ўчынілі здзек яшчэ з бацькоў: прымусілі глядзець на пакуты сыноў і ўласнымі рукамі капаць для іх магілы перад расстрэлам. Пасля з імі таксама расправіліся — у машыне-душагубцы, а целы скінулі ў роў каля бярозаўскага Картэзіянскага манастыра...

А праз пару дзён Міхаіл Неліповіч і Васіль Пейгановіч падарвалі цыстэрну з гаручым і клад з вуглю, пашкодзілі канал дэпо. Абодва загінулі ўжо ў 1945-м, калі працягвалі сваю вайну на фронце, як і Сямён Колас, брат расстралянай разам з сям'ёй Марыі. Быў цяжка паранены ў 1945-м Іван Неліповіч, вярнуліся з фронту Якаў Салавей, адзіны з братоў Барушкаў Аляксей, Віктар Галёнка, які кіраваў падполлем да вызвалення Беларусі. Сустрэлі Перамогу былыя сувязныя Яўгенія Жуковіч, Вера Мычка, Вера Неліповіч.

Камсамольскае падполле было яшчэ ў некаторых вёсках раёна — звесткі пра гэта захоўваюцца ў Бярозаўскім раённым музеі, як і дакументы, што датычацца членаў Блудзенскай групы. Пра іх нагадвае экспазіцыя ў музеі школы аграгарадка Першамайск (былы Блудзень). Іх імёны не вядомыя шырока на ўзроўні краіны, гэта былі сціплыя людзі, для якіх найлепшай узнагародай стала Перамога.

**Ларыса ЦІМОШЫК,**
**матэрыялы дадзены Бярозаўскім гісторыка-краязнаўчым музеем.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015 г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227728, общая площадь – 13,7 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-26 | 21 360,00 |
| 2 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227729, общая площадь – 13,6 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-27 | 21 360,00 |
| 3 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227730, общая площадь – 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-35 | 21 360,00 |
| 4 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227731, общая площадь – 13,5 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-36 | 21 360,00 |
| 5 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227732, общая площадь – 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-37 | 21 360,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 3 (три) рабочих дня** с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.05.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**


НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ...

# ОРДЭН НЕ ПРАДАЕЦЦА

***Мікалай Александровіч, хлопец з нашай бярэзінскай вёскі Хватаўка (пасля вайны — хірург раённай бальніцы) салдатам прайшоў паў-Еўропы. У яго біяграфіі шмат цікавых момантаў: напрыклад, ён браў удзел у сустрэчы савецкіх воінаў з саюзнікамі.***

*Напярэдадні іх вайсковая часць (салдаты — усе ардэнаносцы) перайшла пад камандаванне маршала Жукава. Хлопцам выдалі новую форму, патлумачылі, як трэба сябе паводзіць...*

*Сустрэча на Эльбе, па ўспамінах Александровіча, не была падобнай на тую, што паказваюць у фільме. Ішло «раўнаванне» граніцы: Берлін узялі савецкія войскі, а па дагавору ён павінен быць падзелены на дзве часткі. На той момант перад савецкімі салдатамі стаяла задача заняць тэрыторыю каля Магдэбурга. Таму сустрэча была не ў баявой абстаноўцы. Савецкая калона параўнялася з аналагічнай сустрэчнай саюзнікаў. Адзінае, што адрознівала машыны, гэта намаляваныя на дзверцах аўтамабіляў не чырвоныя, а белыя зоркі.*

*Як толькі калоны спыніліся, амерыканцы сталі саскокваць з кузаваў, хадзіць вакол машын. Усе яны былі вельмі рознымі: хто высокі, хто малы, хто белы, хто цемнаскуры, хто ў пілотцы, хто без... Ураженне — быццам гэтых хлопцаў з вуліцы толькі ўчора набралі ў войска.*

*Прагучалі каманды і для нашых салдат: спачатку — строіцца, потым — вольна, пасля якой пачаліся знаёмствы з саюзнікамі, пацісканне рук... Праехалі машыны з аркестрам, з кінафотаапаратурай.*

*Пасля таго як сустрэчу знялі на плёнку, пачаўся абмен сувенірамі. Да Александровіча падышоў амерыканскі салдат, нешта пачаў гаварыць. Мікалай не разумеў яго: стаў адказваць па-руску, потым па-нямецку. Амерыканец таксама нічога не разумеў. Прыйшлося «загаварыць» на мове жэстаў. Заакіянскі салдат падарыў беларусу малюнкі і невялічкі фотаапарат. Потым стаў працягваць долары і паказваць пальцам на яго ордэн Чырвонай Зоркі — маўляў, хачу, прадай.*



*Мікалай адразу ж «сказаў», што не можа гэта зрабіць, і ў якасці сувеніра падарыў амерыканцу зорачку з пілоткі.*

*Праз нейкі час прагучала каманда «па машынах», і нашы салдаты ўмомант занялі свае месцы.*

*Пасля сустрэчы з саюзнікамі ў іх зусім не засталося зорачак. А вось Зорак, сваіх узнагарод, не падарыў і не прадаў ніхто.*

**Тамара Круталевіч,**
*г. Беразіно.*


**Организатор торгов – частное предприятие «ПАКУМ» извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Мультимоторс Шеринг»**

Аукцион состоится **10.06.2025 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Смолячкова, 9, каб. 426

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота с НДС 20 %, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. | Задаток 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2. | Компьютерная линия диагностики легковых автомобилей MAHA SPECIAL 3.2, производитель: MAHA (Германия), б/у | 19 200,00 | 960,00 | 960,00 |
| 3. | Контейнер (морской), 20 футов, б/у | 5 299,95 | 265,00 | 265,00 |
| 4. | Стеллажи б/у: 2 секции 6 этажей – 1 шт., 2 секции 7 этажей – 3 шт., 2 секции 8 этажей – 1 шт., 2 секции 9 этажей – 2 шт. | 7 420,39 | 371,00 | 371,00 |
| 5. | Стенд развал-схождения колес 3D RAVTD3000BK, производитель: Ravaglioli (Италия), б/у | 12 750,00 | 637,50 | 637,50 |
| 6. | Стенд тормозной роликовый MAHA IW 2 LON (MBT2200LON), производитель: MAHA (Германия), б/у | 3 199,95 | 160,00 | 160,00 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ООО «Мультимоторс Шеринг», тел. +375291307853 |
| **Организатор торгов** | Частное предприятие «ПАКУМ», г. Минск, ул. Смолячкова, 9-426, тел. +375293321936 |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | Частное предприятие «ПАКУМ», УНП 191274798, р/с BY72 ALFA 3012 2E32 2100 1027 0000 в ЗАО «АЛЬФА-БАНК», г. Минск, БИК ALFABY2X4 |

Заявки на участие в торгах принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в срок до 15.00 09.06.2025. Подробная информация о составе лота на сайте pakum.by. Осмотр лота в рабочие дни по предварительной записи по тел. +375291307853. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения и определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте организатора аукциона – https://pakum.by

# АБАРОНІМ НАШУ ПЕРАМОГУ



**Што робіцца для таго, каб не прайграць бітву за розумы людзей, і чаму памяць аб Вялікай Айчыннай вайне — святы абавязак кожнага беларуса**

Больш як восем дзесяцігоддзяў наша краіна не ведае, што такое вайна. Тым не менш падзеі Вялікай Айчыннай — а дакладней, яе ўрокі — як ніколі з'яўляюцца актуальнымі. Сёння мы, нашчадкі народа-пераможцы, павінны адстойваць гістарычную праўду, на якую прэтэндуюць прадстаўнікі шэрагу заходніх краін і за акіянам. Выступаючы на Міжнародным форуме Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня», які на мінулым тыдні прайшоў у Валгаградзе, Прэзідэнт Беларусі казаў аб тым, што праўда аб Вялікай Айчыннай вайне — наш шчыт, а памяць аб Вялікай Перамозе — частка нацыянальнай ідэі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мы, беларусы, расіяне, народы іншых краін былога Савецкага Саюза павінны, зубамі ўчапіўшыся, трымацца за гэту гістарычную памяць, бо іначай усё вернецца зноў. Каб чарговы раз даць адпор фальсіфікатарам і псеўдагісторыкам, абмеркаваць шляхі захавання і перадачы агульнай гістарычнай памяці, напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі ў Выдавецкім доме «Звязда» прайшоў круглы стол пад назвай «Абаронім нашу Перамогу». У ім прынялі ўдзел кіраўнік грамадскага аб'яднання «Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА, памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід КАСІНСКІ, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Аляксандр КАРКАТАДЗЭ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК, намеснік кіраўніка следчай групы Генеральнай пракуратуры па крымінальнай справе аб генацыдзе Сяргей ШЫКУНЕЦ.

***— Згодна з Канстытуцыяй, абарона гістарычнай праўды і захаванне памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Беларусі. Прыняты законы «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму» і «Аб генацыдзе беларускага народа». Наколькі своечасовымі з'яўляюцца гэтыя рашэнні ў кантэксце шматлікіх фальсіфікацый падзей Вялікай Айчыннай вайны?***

**Л. Касінскі:** — Прыняцце гэтых заканадаўчых актаў адпавядае тым павевам, што сёння адбываюцца вакол нашай краіны і ў шэрагу заходніх дзяржаў. Паглядзіце, якую ўтапічную прапаганду яны разгарнулі. Захад, які хваліцца (на словах, праўда) сваёй свабодай слова, забараняе сваім палітыкам прымаць удзел у мерапрыемствах па ўшанаванні памяці загінулых у перыяд Другой сусветнай вайны. Часам чую ад нашых людзей, што, маўляў, немцы зусім з глузду з'ехалі. Не трэба абагульняць. Хутчэй асобныя палітыкі Германіі. У нямецкім грамадстве сярод простых людзей вельмі шмат абурэння. З пазіцыі ваеннага чалавека магу сказаць, што імкненне некаторых заходніх палітыкаў сказіць гістарычную праўду, зраўняць камунізм і фашызм, зрабіць іх аднолькава адказнымі за развязванне Другой сусветнай вайны — гэта спроба ўзяць рэванш, абараніць сваіх продкаў, якія не змаглі супрацьстаяць нацыстам і здалі свае краіны, свае народы практычна без бою.



Леанід КАСІНСКІ.

**І. Марзалюк:** — Дзесьці гэтыя рашэнні былі і запозненыя. Найбольшая хваля фальсіфікацый, калі мы кажам пра гісторыю Беларусі, абрынулася на падзеі Вялікай Айчыннай вайны, якая з'яўляецца самай вялікай трагедыяй для нашага народа. У альтэрнатыўных канцэптах тыя, хто супрацоўнічаў з немцамі, паказваюцца як людзі, якія шукалі трэці шлях, маніфестуецца цалкам фальшывы погляд на тое, што яны былі супраць Сталіна і Гітлера, шукалі дарогу для незалежнай Беларусі. Па сутнасці, у 1990-х — пачатку 2000-х сцвярджалася, што Вялікая Айчынная вайна не была для нас Вялікай Айчыннай, а грамадзянскай, што адказнасць за масавае знішчэнне беларускага насельніцтва ляжыць на партызанах, адмаўляўся характар усеагульнай барацьбы беларускага народа, сам факт генацыду. Знішчэнне насельніцтва трактавалася як парушэнне тых ці іншых канвенцый аб вядзенні вайны. Усе гэтыя «тытанічныя» высілкі былі скіраваны толькі на адно — рэабілітаваць тых, хто з'яўляўся «іконай стылю» для прадстаўнікоў беларускай апазіцыі.

**М. Барысенка:** — У савецкія і постсавецкія часы, нават у гады «халоднай вайны», мы не сустракаліся з такой масавай і шалёнай антыпрапагандай галоўнай ролі СССР у Перамозе падчас Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер гэта супрацьстаянне праходзіць не толькі ў глабальным геапалітычным сэнсе, а пераходзіць ужо на асобныя стратэгічныя, франтавыя, іншыя аперацыі савецкіх і германскіх войск. За апошнія 30 гадоў у грамадскую свядомасць нашых народаў з падачы недабітых нацыстаў і іх былых саюзнікаў па вайне ўпарта ўкараняліся штампы і стэрэатыпы, пастаўленыя на паток з мэтай перапісаць гісторыю, «дэгераізаваць» вайну, рэабілітаваць памагатых гітлераўскіх катаў і апаганіць памяць аб героях, якія аддалі свае жыцці ў барацьбе з фашызмам. Уся гэта прапаганда накіравана на тое, каб максімальна зменшыць значнасць Савецкага Саюза ў дасягненні Перамогі над нацысцкай Германіяй і яе сатэлітамі, аддаючы першынство ЗША і краінам кааліцыі. Але факты і лічбы, скрупулёзна падлічаныя ў канцы вайны, у тым ліку нашымі саюзнікамі (на той час), сведчаць пра адваротнае.

**А. Каркатадзэ:** — Яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў мы ў мемарыяльным комплексе заўважылі, што супраць нашай канцэпцыі аб абароне Брэсцкай крэпасці вядуцца нападкі. Спачатку хаваючыся, а потым адкрыта нашы апаненты пачалі казаць, што абароны Брэсцкай крэпасці насамрэч не было, што гэта савецкі прапагандысцкі міф. А калі і была, то дзеля чаго, па іх словах, трэба было пакідаць там байцоў? Ці не лепей здацца і застацца ў жывых? Такая прапаганда была накіравана найперш на розумы нашай моладзі. Адказам на гэта стала наша даследчая праца, былі выяўлены новыя дакументы, у тым ліку ў нямецкіх крыніцах, створаны новыя экспазіцыі.

**С. Шыкунец:** — Падзеі постэлектаральнага перыяду 2020 года паказалі, што мы сталі забываць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Гэтым умела скарысталіся краіны калектыўнага Захаду, пачаўшы насаджаць розумы і сэрцы, найперш нашай моладзі, інфармацыяй, прасякнутай ілжывымі звесткамі аб Вялікай Айчыннай вайне. Таму востра паўстала пытанне: як ратаваць нашу моладзь? Менавіта ў гэты перыяд і было прынята рашэнне аб узбуджэнні крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, што, па сутнасці, стала прававым бар'ерам на шляху фальсіфікацыі гісторыі. Гэта нацыянальны праект, у аснове якога ляжыць маштабная работа па захаванні гістарычнай памяці. Вынікі расследавання актыўна прымяняюцца ў асноўных сферах дзейнасці дзяржавы: культурнай, адукацыйнай, інфармацыйнай, ідэалагічнай, выхаваўчай, нарматворчай.

***— У чым перавагі дзяржаўна-грамадскага партнёрства ў пытаннях увекавечання памяці загінулых пры абароне Айчыны?***



Сяргей ШЫКУНЕЦ.

**С. Шыкунец:** — У работу па абароне гісторыі; расследаванне крымінальнай справы ўключыліся абсалютна ўсе грамадзяне нашай краіны. Не толькі дзяржслужачыя, пракурорскія работнікі, для якіх расследаванне стала даўно грамадзянскім, а не службовым абавязкам. Задзейнічаны ўсе неабыякавыя грамадзяне. Вельмі шмат інфармацыі ад людзей атрымліваем пра раней невядомыя месцы знішчэння і пахавання.

**Л. Касінскі:** — На розных этапах нашай суверэннай Беларусі адносіны да пошукавай працы грамадскіх пошукавых аб'яднанняў змяняліся. У пачатку 1990-х гадоў, калі панавалі разруха і беззаконне, пошукавая работа вялася ў асноўным так званымі чорнымі капальнікамі. Іх мэтай не было ўвекавечанне памяці. Іх мэтай быў бізнес. Сёння, калі сфарміравана заканадаўства ў сферы пошукавай работы, мы можам казаць аб тым, што ў нас ужо выкрышталізаваўся пошукавы касцяк энтузіястаў, мэта якіх зусім не нажыва, а менавіта захаванне гістарычнай праўды і ўвекавечанне памяці. Таму пазіцыя ваеннага ведамства ў дачыненні да грамадскіх пошукавых аб'яднанняў кардынальна памянялася.

**М. Барысенка:** — Воляй лёсу пошукавікі апынуліся ў першых шэрагах барацьбы за вяртанне ў сям'ю добрага імя салдата, зніклага без вестак на той вайне. Грамадскія пошукавыя арганізацыі Беларусі працуюць у цесным кантакце з Упраўленнем па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны Узброеных Сіл і 52-м пошукавым батальёнам. Такое супрацоўніцтва апраўдана і дае добрыя вынікі ў пошуку невядомых пахаванняў, устанаўленні лёсаў салдат, увекавечанні іх памяці. Улічваючы, што практычна ўся наша краіна ў гады вайны стала арэнай баёў і ў яе зямлі дагэтуль знаходзяцца сотні тысяч воінаў, імёны якіх па-ранейшаму не вядомы, вырашаць гэту праблему трэба ўсім грамадствам.



***— На геапалітычным узроўні разгарнулася сапраўдная бітва за гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, дыскрэдытацыя Вялікай Перамогі стала інструментам інфармацыйнага супрацьборства. Што яшчэ варта зрабіць, каб не прайграць у гэтай бітве? Адзін з найважнейшых крокаў зроблены: мабілізацыя грамадства на захаванне народнага адзінства, нацыянальнай ідэнтычнасці ў кантэксце абясцэньвання ролі беларускага народа ў дасягненні Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне — адна з ключавых задач Дырэктывы № 12.***



Ігар МАРЗАЛЮК.

**І. Марзалюк:** — Калі мы абараняем гістарычную праўду (а мы імкнёмся яе абараніць), не павінны нічога замоўчваць, пазбягаць нязручных пытанняў, аб'ектыўна разважаць у тым ліку на тыя тэмы, дзе, як здаецца на першы погляд, варта памаўчаць. Любое замоўчванне нараджае канцэпцыю недаверу: маладыя людзі думаюць аб тым, што ім нешта недагаворваюць, а значыць, хлусяць. Не варта баяцца паказваць фотаздымкі, кінахроніку такой, якой яна была. У поўнай адпаведнасці з законам. Наш народ супольна з іншымі народамі Савецкага Саюза ўнёс вызначальны ўклад у Вялікую Перамогу. Пра гэта нельга забываць. Мы павінны быць вартымі подзвігу тых, хто і штыком, і пяром змагаўся з акупантамі.

**М. Барысенка:** — У першую чаргу, мы павінны гуляць у доўгую і працаваць на моладзь. Пры такім масіве інфармацыі з розных крыніц трэба ісці ў народ з максімальна праўдзівай і выверанай гісторыяй вайны. Часта фармалізацыя і імітацыя дзейнасці дзеля справаздач і прыгожых карцінак у інтэрнэце перашкаджаюць рэальнаму ўспрыманню маладымі людзьмі падзей вайны. У аснове павінна быць патрыятычнае выхаванне. Пры гэтым важна ва ўсім прытрымлівацца разумнай прапорцыі, каб праз сучасныя чэленджы, флэшмобы і агітпрабегі са сцяжкамі вайна не здалася маладым людзям легкаважнай прагулкай. Вывучэнне рэгіянальнай гісторыі вайны — адна з галоўных прышчэпак супраць скажэння гістарычнай праўды і памяці аб вайне. З закладзеных у сям'і і школе кавалачкаў ведаў у хлопцаў і дзяўчат складаецца першапачатковае ўспрыманне ўсёй вайны. Вывучэнне яе падрабязнасцяў у архівах, пошукавых экспедыцыях, падчас экскурсій выхавае крытычнае стаўленне да фальшывых сцвярджэнняў іншаземных прыгнятальнікаў.

**С. Шыкунец:** — Мы цяпер разумеем, што расследаваць крымінальную справу трэба было нашмат раней. За кошт падтрымання нашай грамадзянскай супольнасці ў актуальным стане, інфармавання аб ходзе, выніках расследавання і адбываецца кансалідацыя беларускага грамадства. Чаму менавіта Вялікая Айчынная вайна стала прадметам скажэння, нападкаў з боку еўрапейскіх краін? Адказ — на паверхні. Любую нацыю заўсёды яднае гора. І вось як з'яднаў нашых бацькоў, дзядоў, прадзедаў 80 гадоў таму адзіны патрыятычны парыў абараніць сваю краіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, так і ўсіх людзей, народжаных у Савецкім Саюзе, гэта трагічная старонка нашай гісторыі заўсёды яднала, зманалічвала. А перапісаць, сказіць, сфальсіфікаваць, прымусіць сумнявацца — значыць выбіць гэты маналіт з-пад ног, пазбавіць увогуле ўсяго.

**Л. Касінскі:** — Варта разумець, што калі прайграем у гэтай інфармацыйнай вайне і фальсіфікатары возьмуць верх над намі, то будучыні ў нашага народа не будзе. У нас, беларусаў, памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай — на генетычным узроўні. Таму важна перадаць гэты генетычны матэрыял народа-пераможцы нашаму маладому пакаленню. І гэта атрымліваецца: у нашай краіне робіцца ўсё для таго, каб мы не прайгралі, а перамаглі ў гэтай вайне. Нягледзячы на тое, што па маштабах, магчымасцях мы супрацьстаім большай колькасці апанентаў, нам удаецца ўтрымліваць наступальныя пазіцыі ў гэтай бітве.

***— 80 гадоў беларусы жывуць пад мірным небам, аднак дагэтуль выяўляюцца новыя факты, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Чаму важна не спыняць гэту работу і што робіцца для таго, каб аб новых фактах даведалася шырокая грамадскасць?***



Мікалай БАРЫСЕНКА.

**М. Барысенка:** — Трэба папулярызаваць у грамадстве вывучэнне падзей вайны, абапіраючыся на вядомых ваенных гісторыкаў, краязнаўцаў, вакол якіх, як правіла, фарміруецца значнае кола зацікаўленых людзей. Менавіта яны дзякуючы сваім ведам, сканцэнтраваным на адным гістарычным перыядзе, часта робяць адкрыцці, знаходзяць новыя гістарычныя факты. Такіх людзей, а гэта «дрожджы грамадства», трэба выяўляць і падтрымліваць, і тады вывучэннем гісторыі вайны будуць займацца не толькі спецыяльныя навуковыя ўстановы, але і людзі захопленыя, якія робяць гэта не за заробак, а па поклічы сэрца і ўнутранай неабходнасці. Такім чынам мы зможам уцягнуць у папулярызацыю і вывучэнне вайны ўсё грамадства, у якім з часам выпрацуецца калектыўны імунітэт і крытычнае стаўленне да любых відаў скажэння праўды пра вайну, якія нам актыўна навязваюць замежныя «добразычліўцы». Прыкладам таму можа служыць грамадскае аб'яднанне «Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны клуб «Віккру», у шэрагах якога на сёння каля 150 чалавек. За 30-гадовую гісторыю клуба праз яго прайшлі больш за тысячу маладых людзей, якія атрымалі прышчэпку ад бяспамяцтва і загартоўку ў барацьбе за аб'ектыўную праўду аб вайне.

**С. Шыкунец:** — Расследаванне крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа працягваецца звыш чатырох гадоў, але ўжо можна казаць аб тым, што маштабы трагедыі ад Вялікай Айчыннай вайны, ад дзеянняў карнікаў і іх памагатых на тэрыторыі нашай зямлі, нашмат большыя, чым лічылася раней. На цяперашні час устаноўлена 12 868 пацярпелых сельскіх населеных пунктаў — пасёлкаў і вёсак, спаленых датла або часткова, у тым ліку разам з жыхарамі. Сярод больш як 3,5 тысячы раней невядомых вёсак, устаноўленых падчас расследавання, — 104 новыя сястры Хатыні. І гэта лічба, як і агульная лічба пацярпелых вёсках, будзе толькі павялічвацца. Устаноўлена больш за сотню раней невядомых лагераў смерці, дзе зверскімі спосабамі знішчаліся мірныя грамадзяне і ваеннапалонныя, больш за 40 раней невядомых карных аперацый, праведзеных на тэрыторыі нашай краіны. Намі дапытана звыш 19,5 тысячы сведак і відавочцаў. Больш за палову з іх — гэта вязні лагераў смерці. З першага дня расследавання мы ў прамым сэнсе слова беглі, спяшаліся засцець іх жывымі. Нават дзеля памяці гэтых людзей, якія перажылі пекла, вызвалілі краіну, аднавілі эканоміку ў кароткія тэрміны, мы павінны абараніць нашу гісторыю. Калі ў народа памяць жыве, то ніхто не асмеліцца замахнуцца на незалежнасць гэтай дзяржавы. Расследаванне крымінальнай справы працягваецца.

**І. Марзалюк:** — На заканадаўчым узроўні зроблены ўсе найважнейшыя захады. Сёння мы павінны займацца сістэмнай навуковай работай. У планах па абароне дысертацый і Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, і гістарычных факультэтаў нашых універсітэтаў прыярытэтнымі тэмамі мусяць быць тыя, якія не атрымалі ўсебаковага асвятлення ў навуковай літаратуры. Для папулярызацыі той ці іншай з'явы найперш неабходны фундаментальныя даследаванні. Увасабленне іх у роліках, фільмах, мастацкай літаратуры павінна адбывацца пасля таго, як тая ці іншая тэма прапрацавана навукоўцамі праз прызму архіўных крыніц, каб нас ніхто не абвінавачваў у неаб'ектыўнасці падачы матэрыялу.

**А. Каркатадзэ:** — Аб тым, што важна не спыняць работу па захаванні гістарычнай памяці, вельмі канкрэтна сказаў наш Прэзідэнт у Валгаградзе. Пытанне гістарычнай памяці, найперш аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, — пытанне выжывання нашага народа. Гэта пытанне захавання нашай незалежнасці. Саюзнікі фашысцкай Германіі яшчэ адкрываюць рот, каб павучаць нас, як нам захоўваць гісторыю. Нам кажуць, што не трэба траўміраваць псіхіку моладзі гэтай тэмай. Але практыка паказала, што трэба. Дзецям трэба расказваць пра жорсткія моманты ў гісторыі нашай краіны, каб яны шанавалі мірны час і разумелі, што за сённяшняе жыццё іх прадзеды аддалі свае жыцці. Працаваць з моладдзю трэба пачынаючы ўжо з дзіцячага садка. У гэтым плане Дырэктыва № 12 вельмі дакладна, адкрыта і гучна абвяшчае аб тым, што ёсць ідэалогія беларускай дзяржавы, што яна заснавана на нашай гісторыі, павазе да яе і мы нікому не дадзім яе ачарніць, сказіць. Выхоўваць можна толькі праўдай.

***— Памяць аб Вялікай Перамозе — аснова патрыятычнага выхавання будучых пакаленняў. Якія формы ў сучасных умовах найбольш эфектыўныя?***



Аляксандр КАРКАТАДЗЭ.

**А. Каркатадзэ:** — Класічныя формы выхавання не перастаюць быць актуальнымі. Гэта і праўдзівая, сумленная гутарка з дзецьмі. Як правільна кажа Прэзідэнт, патрыёта можа выхаваць толькі патрыёт. У рабоце па патрыятычным выхаванні важна ўзаемадзейнічаць з музеямі, тэатрамі, установамі адукацыі, што, уласна кажучы, і робіцца. У 1990-х гадах, пасля распаду Савецкага Саюза, наведвальнасць Брэсцкай крэпасці ўпала з мільёна да 58 тысяч. Мы паступова з гэтай «ямы» выкараскаліся, расказваючы людзям, што нельга гэту тэму забываць, здраджваць памяці нашых продкаў. Дзякуючы палітыцы беларускай дзяржавы, асабістай падтрымцы Прэзідэнта, мемарыяльны комплекс стаў цэнтрам патрыятычнага выхавання. Летась мы ўжо прынялі больш за 600 тысяч чалавек з 29 краін свету, у тым ліку з Кітая, Паўднёвай Амерыкі, ЗША, Заходняй Еўропы, правялі экскурсіі амаль для 13 тысяч груп, што таксама сведчыць аб тым, што людзі перш за ўсё хочуць прыехаць не проста паглядзець музей. Яны імкнуцца знайсці адказы на пытанні, якія іх цікавяць.

**С. Шыкунец:** — Пракурорскія работнікі сумесна з іншымі спецыялістамі прыйшлі нават у дзіцячы садок. Гэта я пра выхаваўчую работу, забеспячэнне ідэалагічнай пераемнасці пакаленняў. Ген патрыятызму ёсць у кожнага з нас, яго трэба развіць. Таксама працуем з дарослым насельніцтвам, моладдзю. У прыватнасці, нядаўна адбылася агульнанацыянальная прэм'ера кінадылогіі «Лагеры смерці» і «Спаленыя вёскі», падрыхтаваная Генпракуратурай сумесна з Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм». Фільмы створаны выключна на падставе вынікаў расследавання, матэрыялаў крымінальнай справы, кінафотаархіўных даных, дзе ўсё паказана без купюр. Тут працуе прынцып — «ідзі і глядзі». Палітыка палітыкай, а гэтыя дзве карціны для кінапракату ініцыятыўна запрасілі прадстаўнікі не менш чым 30 краін. Сярод іх — Літва, Польшча, Германія, Францыя, краіны Лацінскай Амерыкі. Гэта значыць, не толькі ў нашага грамадства, але і ў простага народу ўсяго свету ёсць запыт на праўду аб Вялікай Айчыннай вайне.

**Л. Касінскі:** — Галоўнае — знайсці тыя формы, якія цікавыя сучаснай моладзі. Не проста выйсці перад імі і прачытаць лекцыю, а паспрабаваць уцягнуць у дыскусію, прымусіць самiх акунуцца ў пэўныя крыніцы. З дапамогай тых жа гаджэтаў, без якіх сёння практычна нельга абысціся. Мала хто з маладых людзей прачытае трохтомнік ці чатырохтомнік, у якім, несумненна, выкладзены выдатны матэрыял. Трэба паспрабаваць з гэтай літаратуры выціснуць менавіта тое, што варта закласці ў галовы нашай моладзі.

**М. Барысенка:** — Добры вынік дае ўцягнутасць маладых людзей у пошукавую дзейнасць. Пры гэтым абавязковай умовай з'яўляецца правядзенне ў такіх месцах экскурсій з падрабязным выкладаннем падзей, якія адбываліся ў гады вайны. Пэўную карысць прыносяць аўтапрабегі па гераічных мясцінах баявых подзвігаў старэйшага пакалення ў гады вайны. Папулярным сярод навучэнскай моладзі Магілёўшчыны стаў праект «Навучыся памятаць», арганізаваны пошукавым клубам «Віккру» і Магілёўскім абласным цэнтрам творчасці. Дзеці з задавальненнем даследуюць у архівах, музеях і бібліятэках невядомыя падзеі і новыя імёны герояў, прыбіраюць брацкія пахаванні, удзельнічаюць у стварэнні школьных куткоў баявой славы. З 2022 года яны ўстанавілі імёны соцень воінаў Чырвонай Арміі, якія лічыліся зніклымі без вестак. Іх напрацоўкі перадаюцца ў раённыя аддзелы ідэалагічнай работы і па справах моладзі для наступнага ўнясення новых імёнаў у пашпарты пахаванняў і на брацкія магілы.

**І. Марзалюк:** — Цалкам згодны з нашым Прэзідэнтам, які на форуме ў Валгаградзе сказаў аб тым, што не трэба абмяжоўваць паказ дакументальных жудасных кадраў, хронік дзецям і моладзі. У абавязковым парадку кожнае дзіця, кожны беларускі падлетак, асабліва калі ідзе яго сталенне як асобы, мусіць на свае вочы праз прызму тых кінахронік, экспазіцый пабачыць, што такое абсалютнае адмаўленне чалавечай існасці, што такое фашызм. Не трэба баяцца паказваць фотаздымкі з мэбляй, зробленай з чалавечых костак і абцягнутай скурай, іншыя рэчы, якія друкаваліся ў тамах Нюрнбергскага працэсу. Трэба паказваць, пра гэта казаць, бо памяць чалавечая хуткацечная, і калі мы не будзем расказваць пра тое, як знішчалі нашу самабытнасць, імкнуліся ў прамым сэнсе сцерці з твару зямлі Беларусь разам з яе насельніцтвам, на змену гэтай жудаснай праўдзе прыходзяць хлуслівыя міфы пра «герояў», якія нібыта змагаліся за іншую праўду. Мы павінны абараняць сваё права на сваю гістарычную памяць, свае трактоўкі той вайны і подзвігу нашага народа. А подзвігі беларусы здзяйснялі каласальныя.

**Вераніка КАНЮТА.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу (Гродненский филиал)**

**Аукцион состоится 26.05.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

**Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001008366, площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания многофункционального), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43.<br>Условия проведения аукциона:<br>- оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;<br>- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя;<br>- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |
| **Начальная цена продажи** | 513 634,75 руб. (пятьсот тринадцать тысяч шестьсот тридцать четыре рубля семьдесят пять копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 51 363 руб. (пятьдесят одна тысяча триста шестьдесят три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
